# Юбилеи

# Юбілеі

# Jubilees

## Александр Геннадьевич КОХАНОВСКИЙ

## Аляксандр Генадзьевіч КАХАНОЎСКІ

## Aliaksandr Genadz'evich KAKHANOUSKI



Вядомы беларускі гісторык, доктар гістарычных навук, прафесар, дэкан гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта А. Г. Каханоўскі адзначае 60-гадовы юбілей. Прайшоўшы доўгі шлях ад студэнта да дэкана, Аляксандр Генадзьевіч усё жыццё плённа працуе на карысць роднага факультэта і ўніверсітэта, развівае новыя кірункі гістарычнай навукі, не губляючы сувязь з класічнымі гістарычнымі школамі. Аляксандр Генадзьевіч з'яўляецца заснавальнікам і кіраўніком навуковай школы сацыяльнай гісторыі Беларусі новага і навейшага часу, з якой выйшла плеяда сучасных навукоўцаў-гісторыкаў.

Аляксандр Генадзьевіч нарадзіўся ў 1963 г. на слыннай талентамі маладзечанскай зямлі ў сям'і вядомага беларускага гісторыка і краязнаўца Генадзія Аляксандравіча Каханоўскага. Бацька адыграў ключавую ролю ў фарміраванні светапогляду сына і яго цікавасці да гісторыі роднага краю. У 1985 г. А. Г. Каханоўскі з адзнакай скончыў гістарычны факультэт БДУ і паступіў у аспірантуру, дзе ў 1989 г. пад кіраўніцтвам выдатных спецыялістаў І. М. Ігнаценкі і Л. І. Бародкіна абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Сацыяльна-класавая структура народанасельніцтва Беларусі ў другой палове XIX ст.». З 1988 г. Аляксандр Генадзьевіч з'яўляўся навуковым супрацоўнікам

CC BY NC

універсітэта, актыўна займаўся гістарычнымі даследаваннямі, стаў адным з наватараў па выкарыстанні камп'ютарных тэхналогій у даследчым і адукацыйным працэсе на гістарычным факультэце БДУ.

У 1990 г. Аляксандр Генадзьевіч узначаліў навукова-даследчую лабараторыю гісторыі Беларусі, дзе яскрава праявіліся яго арганізатарскія здольнасці, уменне працаваць у калектыве, наладзіць працэс здабывання новых ведаў, прыцягнуць да даследчай дзейнасці студэнцкую моладзь. З 1992 г. А. Г. Каханоўскі працаваў дацэнтам кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу, а ў 1994 г. стаў намеснікам дэкана гістарычнага факультэта БДУ па навуковай рабоце.

У 1999 г. Аляксандр Генадзьевіч узначаліў кафедру гісторыі Беларусі новага і навейшага часу. Яму ўдалося не толькі захаваць навуковы патэнцыял кафедры, але і істотна папоўніць яе склад маладымі супрацоўнікамі. Дзякуючы намаганням А. Г. Каханоўскага на кафедры склалася новае пакаленне школы сацыяльнай гісторыі Беларусі новага і навейшага часу. Навуковы ўклад гэтай школы ў вывучэнне гісторыі Беларусі прадстаўлены сотнямі навуковых артыкулаў і дзясяткамі манаграфій.

Ажыццяўляючы кіраўніцтва кафедрай, А. Г. Каханоўскі актыўна працягваў займацца навуковай і навукова-метадычнай дзейнасцю. З набыццём нашай краінай незалежнасці з'явіліся новыя падыходы і канцэпцыі ў вывучэнні айчыннай гісторыі. У іх распрацоўцы Аляксандр Генадзьевіч прымаў самы актыўны ўдзел. Ён падрыхтаваў шэраг першых дапаможнікаў, гістарычных карт і атласаў па гісторыі незалежнай Беларусі.

Шырокую вядомасць Аляксандр Генадзьевіч атрымаў як даследчык сацыяльнай гісторыі Беларусі XIX–XX стст., аўтар больш за 200 навуковых артыкулаў, суаўтар шэрагу калектыўных манаграфій, энцыклапедычных выданняў і навукова-метадычных прац. У 2013 г. выйшла даследаванне А. Г. Каханоўскага «Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.)». Выхад кнігі стаў значнай падзеяй у беларускай гістарычнай навуцы. У 2014 г. Аляксандр Генадзьевіч бліскуча абараніў доктарскую дысертацыю. У красавіку 2015 г. прэзідыумам ВАК Рэспублікі Беларусь яму прысвоена вучоная ступень доктара гістарычных навук, а ў 2016 г. – вучонае званне прафесара.

Талент Аляксандра Генадзьевіча, яго поспехі ў навуковай і адукацыйнай сферах не засталіся незаўважанымі не толькі навуковай супольнасцю, але і кіраўніцтвам універсітэта. У 2016 г. Аляксандр Генадзьевіч стаў дэканам гістарычнага факультэта БДУ.

На новай пасадзе Аляксандр Генадзьевіч зрабіў вельмі шмат для развіцця гістарычнага факультэта як галоўнага цэнтра гістарычнай адукацыі ў краіне, важнага навуковага асяродка. Спіс традыцыйных спецыяльнасцей, па якіх на факультэце вядзецца навучанне, папоўніўся запатрабаванай спецыяльнасцю «рэгіёназнаўства», сумеснай магістарскай адукацыйнай праграмай БДУ і МДУ «гісторыя беларускай дыяспары». Дзякуючы намаганням у тым ліку Аляксандра Генадзьевіча ў корпусе гістарычнага факультэта БДУ пачаліся рамонтныя работы, была мадэрнізавана яго матэрыяльна-тэхнічная база. Пасля вяртання будынка ў эксплуатацыю ён павінен стаць факультэтам-музеем. Сэнсавае і зместавае напаўненне канцэпцыі яго новага выгляду праводзілася калектывам падраздзялення пад кіраўніцтвам дэкана А. Г. Каханоўскага. Можна смела сказаць, што факультэт з упэўненасцю глядзіць у будучыню, развіваецца, складае праекты і мае шырокія перспектывы для паспяховага руху наперад. Безумоўна і тое, што немалая частка заслуг у гэтым належыць Аляксандру Генадзьевічу Каханоўскаму.

Нельга не адзначыць незвычайную працавітасць юбіляра. Выконваючы абавязкі дэкана, Аляксандр Генадзьевіч адначасова з'яўляецца старшынёй навукова-метадычнага савета па гістарычных навуках і тэалогіі вучэбна-метадычнага аб'яднання па гуманітарнай адукацыі, старшынёй каардынацыйнай рады па развіцці гістарычнай навукі і адукацыі пры Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь, старшынёй конкурснай камісіі Рэспубліканскага конкурсу навуковых работ студэнтаў секцыі «Гісторыя Беларусі. Усеагульная гісторыя. Праблемы ўзаемадзеяння цывілізацый», сакратаром камісіі па навукова-метадычным забеспячэнні гістарычнай палітыкі Рэспубліканскага савета па гістарычнай палітыцы пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, старшынёй камісіі секцыі «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы» па ведамаснай навукова-тэхнічнай экспертызе Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, сукіраўніком праграмы «Гісторыя» дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы», членам шэрагу калегіяльных дарадчых і экспертных органаў, рэдакцыйных калегій навуковых выданняў. А. Г. Каханоўскі – галоўны рэдактар выдання «Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя», які стаў адзіным гуманітарным часопісам Беларусі, уключаным у міжнародную базу даных *Scopus*. Штогод Аляксандр Генадзьевіч становіцца старшынёй праграмных камітэтаў міжнародных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцый, круглых сталоў, дыялогавых пляцовак і г. д. А. Г. Каханоўскі прымаў удзел у абмеркаванні і падрыхтоўцы навуковых мерапрыемстваў, звязаных з археалагічнымі даследаваннямі на р. Менцы ў в. Гарадзішча. Немалая адказнасць кладзецца на плечы А. Г. Каханоўскага і ў сувязі з займаннем пасады вучонага сакратара Савета БДУ, старшыні савета гістарычнага факультэта БДУ,

а таксама старшыні савета па абароне дысертацый пры БДУ.

Аляксандр Генадзьевіч знаходзіць час і для сваіх вучняў. Пад яго кіраўніцтвам абаронена некалькі дзясяткаў магістарскіх работ, 11 кандыдацкіх і 1 доктарская дысертацыя. Як заснавальнік і лідар школы сацыяльнай гісторыі Беларусі новага і навейшага часу, Аляксандр Генадзьевіч працягвае кіраваць напісаннем курсавых, дыпломных, магістарскіх работ, кандыдацкіх дысертацый, з'яўляецца навуковым кансультантам па доктарскіх дысертацыях.

За вялікі ўклад у рэалізацыю сацыяльнай палітыкі Рэспублікі Беларусь і шматгадовую навукова-педагагічную дзейнасць Аляксандр Генадзьевіч адзначаны шматлікімі дзяржаўнымі ўзнагародамі: медалём Францыска Скарыны, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, знакам «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь» і інш.

У паўсядзённым жыцці А. Г. Каханоўскі – адкрыты і добразычлівы чалавек. Ён заўсёды справядліва і ўважліва ставіцца да калег і студэнтаў, праяўляе сябе як дбайны кіраўнік. Акрамя таго, ён адданы сям'і муж і бацька.

Калегі, сябры і вучні шчыра віншуюць Аляксандра Генадзьевіча з юбілеем і ад усяго сэрца жадаюць яму здароўя, шчасця, сямейнага дабрабыту, а таксама натхнення і новых дасягненняў на ніве гістарычнай навукі і педагагічнай працы.

***А. А. Гужалоўскі*[1], *В. І. Менькоўскі*[2], *А. А. Яноўскі*[3],**
***В. С. Макарэвіч*[4], *Г. І. Маскевіч*[5]**

[1]*Александр Александрович Гужаловский* – доктор исторических наук, профессор; профессор кафедры этнологии, музеологии и истории искусств исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Аляксандр Аляксандравіч Гужалоўскі* – доктар гістарычных навук, прафесар; прафесар кафедры этналогіі, музеалогіі і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Aliaksandr A. Huzhalouski*, doctor of science (history), full professor; professor at the department of ethnology, museology and history of arts, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *etnology@bsu.by*

[2]*Вячеслав Иванович Меньковский* – доктор исторических наук; профессор кафедры истории России исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Вячаслаў Іванавіч Менькоўскі* – доктар гістарычных навук; прафесар кафедры гісторыі Расіі гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Viachaslau I. Menkovski*, doctor of science (history); professor at the department of Russian history, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *menkovski@bsu.by*

[3]*Олег Антонович Яновский* – кандидат исторических наук, профессор; заведующий кафедрой истории России исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Алег Антонавіч Яноўскі* – кандыдат гістарычных навук, прафесар; загадчык кафедры гісторыі Расіі гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Aleh A. Yanovsky*, PhD (history), full professor; head of the department of Russian history, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *helgoleg@mail.ru*

[4]*Виталий Сергеевич Макаревич* – кандидат исторических наук; заведующий кафедрой истории Беларуси нового и новейшего времени исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Віталь Сяргеевіч Макарэвіч* – кандыдат гістарычных навук; загадчык кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Vitaly S. Makarevich*, PhD (history); head of the department of Belarusian history of new and contemporary times, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *makarevs@bsu.by*

[5]*Анна Ивановна Маскевич* – кандидат исторических наук; заместитель декана исторического факультета по научной работе и международному сотрудничеству, доцент кафедры истории Беларуси нового и новейшего времени исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Ганна Іванаўна Маскевіч* – кандыдат гістарычных навук; намеснік дэкана гістарычнага факультэта па навуковай рабоце і міжнароднаму супрацоўніцтву, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Hanna I. Maskevich*, PhD (history); deputy dean of the faculty of history for research and international cooperation and associate professor at the department of Belarusian history of new and contemporary times, faculty of history, Belarusian State University.